# АСАБІСТЫ СКЛАД ПАРТЫЗАНСКІХ ФАРМІРАВАННЯЎ НА ТЭРЫТОРЫІ ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ (1941–1944 ГГ.)

**І. В. Чарняўскі**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, г. Мінск;*
*cherny-95@mail.ru;*
*навук. кір. – У. К. Коршук, д-р гіст. навук, праф.*

Актуальнасць дадзенай публікацыі абумоўлена адсутнасцю ў гістарыяграфіі спецыяльных работ аб асабістым складзе партызанскіх фарміраванняў на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны (1941–1944 гг.), а таксама неабходнасцю аб'ектыўнай ацэнкі сацыяльнага паходжання; нацыянальнай, узроставай і палавой прыналежнасці «народных мсціўцаў» на тэрыторыі пяці заходніх абласцей. Акрамя таго важна закрануць цэлы шэраг штампаў адносна партызанскага руху ў гэтым рэгіёне, якія ўкараніліся ў гістарычнай навуцы. Мэта публікацыі – вызначыць паходжанне і колькасць асабовага складу партызанскіх фарміраванняў на тэрыторыі Заходняй Беларусі (1941–1944 гг.). Аб'ект даследавання: савецкія партызанскія фарміраванні, якія дзейнічалі на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў гады ВАВ.

***Ключавыя словы***: Вялікая Айчынная вайна; савецкі партызанскі рух; Заходняя Беларусь; асабовы склад; нацыянальная прыналежнасць; камандны склад; сацыяльнае паходжанне.

Важны ўклад у справу вызвалення Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны ўнеслі партызаны Заходняй Беларусі. На 1941 г. яе тэрыторыя ўключала Вілейскую, Беластоцкую, Баранавіцкую, Брэсцкую і Пінскую вобласці, што складала 43 % ад усёй плошчы БССР. Агульная колькасць насельніцтва тут была роўная 4,8 млн. чалавек, або 46 % ад усяго насельніцтва рэспублікі. У гады ВАВ уся Заходняя Беларусь з 1941 па 1944 гг. знаходзілася пад нямецкай акупацыяй. Пры гэтым шэраг асаблівасцяў гістарычнага развіцця абумовіў некаторыя адметныя рысы ў разгортванні тут барацьбы супраць акупантаў. Адбілася гэта і на асабістым складзе партызанскіх фарміраванняў [3, с. 3].

Важнай сілай у тыле ворага ў заходніх абласцях БССР былі былыя ўдзельнікі нацыянальна-вызваленчай барацьбы пры паляках у 1920–1930-х гг.: члены Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі (КПЗБ) і Камуністычнага саюза моладзі Заходняй Беларусі (КСМЗБ). Па-першае, большасць з іх была мясцовымі жыхарамі: яны ведалі тэрыторыю і людзей, падтрымлівалі кантакты з былымі паплечнікамі, карысталіся пэўным аўтарытэтам. Па-другое, яны мелі вялікі вопыт падпольнай работы, маглі ў кароткія тэрміны выканаць пастаўленую задачу. Па-трэцяе, нягледзячы на сумны канец КПЗБ, многія былыя падпольшчыкі заставаліся верныя сваім ідэалам і перакананням.

Найбольш арганізаванай і маральна ўстойлівай групай асабістага складу партызанскіх фарміраванняў на тэрыторыі Заходняй Беларусі былі вайскоўцы Чырвонай Арміі. Большая частка афіцэрскага і тым больш палітычнага складу была партыйнай. Многія з сяржанцкага і радавога складу – камсамольцамі. Пасля далучэння ў 1939 г. Заходняй Беларусі да БССР і адпаведна пераносе дзяржаўнай мяжы на захад, пачалося паступовае ўзмацненне ваеннай моцы Заходняга Ваеннага акругі. Да 1941 г. сюды з розных канцоў Савецкага Саюза была пераведзена вялікая колькасць вайсковых злучэнняў розных родаў войскаў.

Вялікае значэнне для будучага разгортвання партызанскага руху на тэрыторыі Заходняй Беларусі і папаўнення асабістага складу фарміраванняў «народных мсціўцаў» мела акружэнне летам 1941 г. 11 савецкіх дывізій са складу 3, 4, 10 і 13 армій. Больш шырока яно вядома пад назвай «Навагрудскі кацёл». Вырваўшыся на волю з лагераў для ваеннапалонных, шмат каму ўдалося схавацца пад выглядам сваякоў, бежанцаў і г.д. у мясцовага насельніцтва. Некаторыя нават паспявалі ажаніцца і абзавесціся сем'ямі. Але ўсё ж, вялікая іх частка пражывала нелегальна. Пры сустрэчы з немцамі або паліцыяй у лепшым выпадку гэтых людзей адправілі б назад у лагер, а ў горшым маглі проста расстраляць на месцы [1, с. 1–3].

Даволі часта, як у груп, так і нават у цэлых атрадаў, якія перайшлі да партызанскай вайны, сустракалася імкненне дайсці да лініі фронту і перайсці яе, каб уліцца ў Чырвоную Армію. Аднак толькі малой частцы тых, якія пайшлі на ўсход, гэта ўдалося. Напрыклад, партызанскі атрад пад камандаваннем Г. М. Картухіна, створаны на тэрыторыі Баранавіцкай вобласці, сустрэў іншае партызанскае фарміраванне і сышоў на тэрыторыю Украіны. Большасць жа гінула па шляху, трапляючы ў засады або сутыкаючыся з добра ўзброенымі часткамі праціўніка; многіх выдавала мясцовае насельніцтва або здраднікі; некаторыя гінулі ўжо непасрэдна пры пераходзе лініі фронту [4, с. 22].

Былыя вайскоўцы РСЧА былі своеасаблівым «шкілетам» партызанскіх фарміраванняў: яны мелі ваенную падрыхтоўку, пэўныя спецыяльныя навыкі і, што вельмі дапамагала выжыць у тыле ворага – баявы вопыт. Таксама немалаважна было і тое, што яны не мелі сваякоў і сем'яў на акупаванай тэрыторыі. Па-трэцяе, яны мелі маральныя абавязацельствы перад Савецкай уладай: ім трэба было праявіць сябе з лепшага боку, каб не выглядаць здраднікамі. Нядзіўна, што пераважная колькасць каманднага складу было менавіта былымі вайскоўцамі РСЧА.

Што тычыцца жыхароў сельскай мясцовасці, то тут былі некаторыя асаблівасці. Па-першае, сялянства заходніх абласцей БССР, сутыкнуўшыся ў перыяд 1939–1941 гг. з цэлым шэрагам

мерапрыемстваў Савецкай улады, шмат у чым было незадаволена становішчам рэчаў. Асабліва ў эканамічным плане. Галоўным для селяніна была магчымасць свабодна працаваць на сваёй зямлі, распараджацца вынікамі працы, утрымліваць сям'ю. Таму ў пачатку нямецкай акупацыі, калі захопнікі не паказалі свае сапраўдныя задумы, нельга казаць аб павальнай незадаволенасці сярод сялян Заходняй Беларусі. Яны плацілі падаткі, як і пры Саветах, затое ўжо не было калгасаў. Аднак з часам ілюзіі развеяліся, і настала расчараванне. Стала ясна, што і пры немцах добрага жыцця ня будзе. Нягледзячы на ўсе складанасці адсотак сялян у партызанскіх фарміраваннях на тэрыторыі Заходняй Беларусі быў высокі [5, с. 1–20].

Нацыянальная прыналежнасць асабовага складу партызанскіх фарміраванняў плаўна выцякае з яго сацыяльнага становішча: чым гэтыя людзі займаліся да вайны. Калі казаць пра ваеннаслужачых Чырвонай Арміі, то ў СССР прызыўнік мог апынуцца на службе ў любой частцы вялізнай дзяржавы. З-за гэтай асаблівасці прысутнасць у асабістым складзе партызанскіх фарміраванняў людзей розных нацыянальнасцяў адзначаецца па ўсёй тэрыторыі Беларусі. Вялікую долю тут складалі рускія і ўкраінцы. Што тычыцца сялян, то пераважная іх большасць была мясцовымі жыхарамі беларускай нацыянальнасці. Нельга не сказаць пра габрэяў. У асабістым складзе партызанскіх фарміраванняў на тэрыторыі Заходняй Беларусі іх доля была немалой. Па сацыяльнаму становішчу яны часцей за ўсё траплялі пад катэгорыю інтэлігенцыя. У сувязі з масавым знішчэннем габрэяў, якое ажыццяўлялі немцы і іх памагатыя, яны даволі часта аказваліся ў шэрагах «народных мсціўцаў» [2, с. 1–2]. Адзначаны выпадкі стварэння цэлых габрэйскіх як сямейных, так і баявых атрадаў (напрыклад, атрады ім. Калініна і ім. Арджанікідзэ (Баранавіцкая вобл.)) [6, с. 1-53].

Большасць партызанскіх фарміраванняў на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў перыяд 1941–1942 гг. мелі прыкладна аднолькавую колькасць: ад 20–30 да 100–150 чалавек. Падобнай была і арганізацыйная структура гэтых фарміраванняў. Ключавую ролю ажыцяўлялі камандзір і камісар, у меншай ступені начальнік штаба. Важна адзначыць, што камандзіры ў разгляданы перыяд часу былі абранымі, а не прызначанымі (у той прамежак часу не было каму гэта рабіць: сувязі з Вялікай зямлёй у большасці фарміраванняў не было).

Такім чынам, можна зрабіць некаторыя высновы аб тым, што на тэрыторыі заходніх абласцей БССР не ўдалося правесці загадзя неабходную падрыхтоўчую працу па стварэнні партызанскіх фарміраванняў, падборы надзейных кадраў для іх, іх узбраенні і забеспячэнню неабходным. Большасць савецкіх і камсамольскіх

актывістаў паспела адступіць на ўсход з часткамі Чырвонай Арміі. Многія з іх загінулі. Вялікая аддаленасць ад лініі фронту вельмі ўскладняла прыбыцце сюды з савецкага тылу арганізатарскіх груп для разгортвання барацьбы супраць акупантаў. Таксама на гэтых тэрыторыях вельмі адбілася і неаднароднасць сацыяльнай структуры насельніцтва, абумоўленая няскончанасцю сацыялістычных пераўтварэнняў: бо не варта забываць, што Савецкая ўлада прыйшла на гэтыя землі ўсяго пару гадоў таму. Усё гэта ў пэўнай меры ўскладняла і запавольвала працэс развіцця падпольнай і партызанскай барацьбы.

Па сацыяльнаму становішчу асноўная частка асабовага складу партызанскіх фарміраванняў на тэрыторыі Заходняй Беларусі была прадстаўлена партыйна-камсамольскім актывам, савецкімі работнікамі, вайскоўцамі і мясцовымі жыхарамі. У кожнай з гэтых груп была свая матывацыя адносна ўступлення на шлях узброенай барацьбы з акупантамі. Сацыяльным становішчам тлумачыцца і нацыянальны склад, у якім прыкладна аднолькавы працэнт складалі беларусы і рускія, затым ішлі ўкраінцы і габрэі, далей – іншыя нацыянальнасці.

**Бібліяграфічныя спасылкі**


1. *Басюк І. А.* Навагрудскі «кацёл». Гродна, 1998.
2. *Дафі П.* Браты Бельскія. М., 2011.
3. *Шубін Г. А.* З гісторыі ўсенароднай барацьбы супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў ў заходніх абласцях Беларусі (чэрвень 1941 – ліпень 1944 гг.). Валгаград, 1972.
4. Партызанскія фарміраванні Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны (чэрвень 1941 – ліпень 1944 г.) : кароткія звесткі аб арганізацыйнай структуры партызанскіх злучэнняў, брыгад (палкоў), атрадаў (батальёнаў) і іх асабістым складзе / А. Л. Манаенков [і інш.]. Мн., 1983.
5. Спіс асабовага складу атрада «Барацьба» Ленінскай партызанскай брыгады // Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). Фонд 1399. Воп. 1. Спр. 618.
6. Спіс асабовага складу атрада ім. Арджанікідзэ бр. ім. Кірава // НАРБ. Фонд 1399. Воп. 1. Спр. 448.